# «У нас няма Калізея, у нас ёсць Гальшанскі замак!»

## На Гродзеншчыне ўпершыню прайшоў фестываль «Гальшанскі замак»



Дзеянне на галоўнай сцэне свята не спынялася ні на хвіліну.

**Фестываль, які на гальшанскай зямлі ладзіўся першы раз, плануе стаць штогадовым. Сёлета ён прымеркаваны да 10-годдзя гурта «Стары Ольса», у наступным годзе чакаецца 400-я гадавіна Гальшанскага замка...**

Пачатак фэсту асабліва не ўражваў: пасля шэсця моладзі ў стылізаваных касцюмах эпохі Сярэднявечча, на сцэну выйшлі мастацкія калектывы. Хораша спявалі: пра «Купалінку» і пра тое, «як цячэ вада ў ярок». Мяне, прынамсі, адразу на ўспаміны пацягнула: поле, жніво, каня ля крыніцы плача... Толькі вось ненадоўга хапіла беларускага фальклору, перайшлі на рускі: пра «степной бурьян» і «раскудрявый клён зелёный». Слова «зелёный» з такой асіміляцыйнай мяккасцю вымаўлялася, што станавілася сумна...

Людзі на пляцы варушыліся, як мурашы ў жніўні: гандляры ўладкоўвалі апошнія тавары, з нагі на нагу пераступалі журналісты... Туды-сюды снаўдалі скамарохі ў характэрным адзенні, пацiху на машынах пад'язджалі наведвальнікі: з Мінска, Ашмянаў, Астраўца, Варнянаў... На гэтым фоне са сцэны даносіліся абрыўкі «Кацюшы», а праз колькі хвілін заспявалі «День Победы». Гэта, відаць, у падтрымку таго, што фестываль сёлета ладзіцца ўпершыню, і «Стары Ольса», які будзе яшчэ выступаць, адзначае сваю маленькую перамогу — 10 гадоў з моманту заснавання...

### ТУРЫСТЫЧНЫ ЗАМАК ГАЛЬШАНСКІ

— Сёння ў Гальшанах працуюць 3 аграсядзібы, яшчэ пяць — на стадыі афармлення, — расказвае пра Гальшаны **старшыня Ашмянскага райвыканкама Юрый АДАМЧЫК**. — Ёсць гасцініца на 15 месцаў. Але трэба працаваць над тым, каб усе турысты: ад маладой сям'і да карпаратыўнага аўтобуса атрымлівалі добрыя і якасныя паслугі, пачынаючы ад побытавых і заканчваючы шашлыком, лазняй і пейнт-болам. І каб злавіць кола турыстычных інтарэсаў, такіх «фішак» павінна быць не менш за сто. У нас няма Калізея, у нас няма пірамідаў, але ў нас ёсць Гальшанскі замак. Пакуль мы спрабуем — і ў нас атрымліваецца — эксплуатаваць ідэю прывідаў. Выкарыстоўваць сам брэнд «Гальшанскі замак» і легенды, якія з ім звязаныя. Сёння мы не вядзём гаворку пра ўзнаўленне замка ў першапачатковым выглядзе, але ёсць вельмі добрыя ідэі па кансервацыі замка і стварэнні экспазіцыі пад адкрытым небам: прычым руіны можна выкарыстоўваць у тым выглядзе, у якім яны захаваліся да сёння.

— Тут вельмі своеасаблівая аўра, вельмі слынная і багатая гісторыя, — дадае **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валянціна ЛУЗІНА**. — Разглядаецца пытанне пра аднаўленне сістэмы сажалак ля Гальшанскага замка. У кастрычніку пачнуцца работы па вынасе высакавольтных ліній электраперадач з тэрыторыі, якая прылягае да аб'екта. У работы плануецца ўкласці ад 210 да 250 млн. Тым больш, што наступны год — знакавы для Гальшанскага замка, 400-годдзе з моманту пабудовы. І я думаю, што ў 2010-м наш фэст стане самым цікавым з тых, якія ладзяцца сёння ў Беларусі. Налета плануем зрабіць фэст прывідаў...

Сёлетні фестываль, на думку Юрыя Адамчыка, — выдатная магчымасць рэкламы для Гальшан. Таму прапанову прымеркаваць падзею да 10-годдзя гурта «Стары Ольса» ўспрынялі з радасцю. Нават сумесна з іншымі спонсарамі дапамаглі з арганізацыяй. **Газета «Звязда» таксама не засталася ўбаку — мы выступалі як інфармацыйны спонсар.**

— Увогуле, я б назваў гэты фэст фестывалем анамальнага турызму: тут усё разлічана на прывіды, здані і г.д., — смяецца **заснавальнік і кіраўнік гурта «Стары Ольса» Зміцер САСНОЎСКІ**. — Але з гэтым брэндам можна раскруціцца вельмі ўдала. На фэст мы запрасілі нашых сяброў — таксама гурты сярэднявечнай музыкі. Таксама пастараліся сабраць усіх удзельнікаў нашага гурта розных гадоў (звычайна змяняліся толькі флейтысткі).

— Мы ўвогуле вырашылі выступаць як мага больш на дабрачынных канцэртах, не выстаўляючы высокіх ганарараў. І як пастанавіў калектыў, для сваіх людзей, якія з'яўляюцца непасрэднымі нашчадкамі тых, чыю музыку мы выконваем, гэта варта зрабіць бясплатным. Сярэднявечнай музыкі ў Еўропе цяпер шмат, але ў кожнай краіне яна развіваецца па-свойму. У Літве ўзяты кірунак у народную сферу, у Польшчы развіццё набыла музыка камернага кірунку. Гуртоў, якія б выконвалі і камерную, і народную, і духоўную музыку, і т.зв. «вулічны» фальклор, вельмі мала. Чэхія, Германія, Францыя — вось, відаць, самыя перадавыя краіны ў гэтым. І ў нас гэты ўзровень з натуральнымі і гукаўзмацняльнымі інструментамі таксама добры.

Бліжэй пад абед пляц ля Гальшанскага замка ўсё напаўняўся — людзей прыязджала ўсё больш.

— Прыехалі ўсёй сям'ёй сюды, — прызнаецца Ян Матулай з Варнянаў. — Усё падабаецца, вось, сына на кані пакатаў. Арганізацыя добрая, адзіная нязручнасць — гэта арганізацыя месцаў для паркоўкі.

— Мы тут першы раз, — дзеліцца ўражаннямі сям'я Мордаль з Мінска. — Убачылі па тэлевізары рэкламу пра фестываль і вырашылі прыехаць. Натуральна, чулі і пра легенду Гальшанскага замка. Паспелі, дарэчы, і сувеніры тут набыць. Адзін з іх — фігурка дзедабарадзеда.

— Турыстаў прыязджае шмат, асабліва па нядзелях, — расказала карэспандэнту «Звязды» **мясцовая жыхарка ВАЛЯНЦІНА**. — І каля замка ўсё ходзяць. А Гальшаны? Кароў у статку ўжо мала, але на пашу яшчэ ганяем, хоць холадна, але што рабіць. Вуліцаў у нас шмат, кароў мала, дык мы па дзве вуліцы адразу. Людзі не хочуць кароў трымаць, усё больш на козаў перайшлі — зручней. А што да фестывалю, то мне ўсё падабаецца, вельмі добра выступаюць.

### І СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ, І НА ГАСЦЕЙ ПАГЛЯДЗЕЦЬ


Страляць з лука — цэлая навука.

Пазначаныя ў праграме «атракцыёны» ўяўлялі сабой забавы ранняга Сярэднявечча: «амерыканскія горкі» ў іх былі замененыя на ліцвінскія дзіды і лукі. Першыя можна было пакідаць, а з другіх пастраляць. І адно, і другое за сімвалічную плату ў тысячу беларускіх рублёў. Толькі вось наведвальнікі нейкія ўсе скрозь «касавокія» былі: ніводзін не пацэліў.

Асабіста маю ўвагу прыцягнулі неверагоднай прыгажосці дудачкі. Памятаецца, вясной нешта падобнае я бачыў у Вільнюсе, дзе яны прадаваліся за 10 літаў.

— А колькі ў вас гэтая дудка каштуе? — пытаю пра размалёваную дудачку ў гандляркі.

— 6 тысяч. Ручной работы.

Гэтыя гандляры прыехалі на свята са Слоніма, дзе трымаюць адмысловую студыю па вырабе ўсяго такога. Увогуле «восеньскі кірмаш», акрамя дудак, прапаноўваў таксама сплеценыя з саломы розную драбязу, тыпу кулонаў, фенечак, закладак і аплікацый.

Меламаны ж маглі набыць дыскі з беларускімі казкамі-калыханкамі (ваша дзіця будзе пад іх засынаць, калі не пашкадуеце 15 тысяч), дыскі «Вясковая лірыка» з дзіўнымі птушкамі-кветкамі на вокладцы, аўдыёкнігі Караткевіча, Някляева і іншых. Аматары беларускага рэпу (траплялiся і такія) ахвотна пыталіся пра альбом «Пачатак» рэпера Vincenta. Карацей, купляць — не перакупляць: абы было за што.

Апроч дыскаў, саламяных фенечак, бурштынавых пацерак і драўляных рэчаў у стылі канструктывізму можна было набыць і міні-пірог з яблыкамі. Амаль за тры тысячы. Чым карэспандэнт «Звязды» разам з калегамі і скарыстаўся. Разам і танней, і весялей.

Хоць яблыкамі ў тым сочыве толькі пахла, але мы запівалі яго гарачай гарбатай, і нам мроілася, нібыта за сталом у Сапегаўскім двары сядзім: рабілася цёплей і хацелася танчыць.

Не ведаю, колькі людзей падсілкавалася пірагом ля чынам, але, мяркуючы па моладзі, якая, прытанцоўваючы пад сцэнай, махала рукамі, яблычны водар зацанілі многія.

Вулічныя тролі, блазны і паненкі (такіх стылізавана апранутых гасцей на святе было шмат) станавіліся ў кола і зладжаным тэмпам падскоквалі ў такт музыцы. Гэта было прыгожа і самабытна. Але пасля да іх далучаліся навічкі-аматары — у вязаных швэдрах, прыталеных джынсах і спартыўных штанах — і тады ўсё разам стала нагадваць школьны выпускны баль...

Гурт «Унія», які быў на сцэне, словамі сваіх песень здзіўляў. Прынамсі, некаторыя з іх песень падаліся мне двухсэнсоўнымі. Узяць хоць бы гэтыя радкі: «Любі мяне, кавалёк, падару вугалёк...»

Апагеем такой эклектыкі стала рокавая песня гурта «Унія». Трэба было бачыць, як калбасіліся пад яе паненкі ў стылізаваных сярэднявечных строях! Ды мяне б за такія танцы ды пад сценамі замка ў XV стагоддзі на вогнішчы спалілі б! І паненак тых, напэўна, таксама. Ці, можа гэта падэспань так адаптавалі?

Як бы там ні было, галоўнае — што весела. І цёпла. Бо ў такое надвор'е, калі ногі прымярзаюць да глебы, а рукі без пальчатак падобныя на хадулі ў цырку, трэба было неяк грэцца. Сапраўды ж сваёй шчырасцю і непасрэднасцю публіку сагрэлі дзве маленькія дзяўчынкі гадоў сямі. Стоячы ў эпіцэнтры, малыя трымалі ў руках тыя самыя пафарбаваныя дудкі за 6 тысяч, пра якія ўзгадвалася вышэй. Ды не проста трымалі, а прысядаючы ў такт з музыкай, з усёй моцы ў іх дулі, стараючыся прычыніцца да агульнай справы. Вось дзе пакаленне падрастае!

— Гандаль — дрэнь, слабы вельмі, — прызналася «Звяздзе» прадавачка саламяных шкатулак і пластмасавых бірулек, якіх навалам на кожным базары. — Гэта ў білетах прычына: такія кошты заламалі! Дваццаць тысяч з чалавека, а з дзіцяці да васьмі гадоў — пятнаццаць... Трэба было, каб дзеці бясплатна ішлі, а з дарослых тысяч па пяць...

### ІГРАЛІ «МАРАЗУЛЬКУ», НАЗІРАЛІ ЗА ТАНЦУЛЬКАЙ

А пасля былі зноў спевы, зноў ігралі на дудзе. Таму калі надышла чарга імяніннікаў, вечар ужо патанаў у цемры. Асабліва «вынаходлівыя» ўсцягнулі на галовы цацачныя рогі, якія ззялі чырвоным святлом. Вельмі арыгінальна на фоне абрысаў Гальшанскага замка!

А справа ад уваходу на пляцоўку, дзе дзяжурылі ахоўнікі (уваход — толькі па білетах), сваю «службу» неслі мясцовыя хлапчукі, якім не хапіла на білет. Сцэна адсюль хоць і была не надта бачная, але затое за гук беларускай дуды, які сюды добра далятаў, плаціць не патрабавалася.

На сцэне стаялі ўдзельнікі «Старога Ольсы». У адаптаваным адзенні, у смешных чаравіках, з шыкоўнымі па гучанні музычнымі інструментамі, яны больш паходзілі на казачных эльфаў... Песня заканчвалася, і лідар гурта пытаўся ў публікі, што яна хоча пачуць зараз. Выбар сапраўды быў: за плячыма гурта восем альбомаў...

«Ружу давай! Ружу!», «У карчме!!!», «У карчме!!!» Многія добра ведалі рэпертуар музыкаў. Таму з першых нот песня падхоплівалася, і народ пачынаў спяваць. Прычым паралельна з танцамі. Асабліва даспадобы прыйшоўся спеў «Слаўся, князь Вітаўт, гаспадар стагоддзяў», калі ў скокі пусціліся літаральна ўсе: ад старога да малога. Скажу шчыра, у гэты момант я адчуў сябе жыхаром сапраўднага ВКЛ. І навошта вучыць нейкія там ірландскія танцы, калі ёсць свае, беларускія, не менш цікавыя і не менш прыгожыя. Са сваёй гісторыяй, традыцыяй, са сваім непаўторным беларускім духам!

Наколькі ж багатая на традыцыі наша зямля, як шалёна мы можам любіць сваю родную зямлю і сваю родную мову, калі захочам! Чаму ж мы так рэдка гэта робім?

На сцэне тым часам музыкі пачалі іграць «Маразульку». Аднайменны танец быў падхоплены вулічнымі тролямі і паненкамі ў сярэднявечных строях. У момант да іх далучыліся ўсе астатнія, у вязаных швэдрах, прыталеных джынсах і спартыўных штанах, і ўсё разам гэта глядзелася так прыгожа і так самабытна, што нават не верылася, што гэта такое ў нас, у Беларусі дзееца...

І прызнацца, нават там, дзе не танчылі, людзей было шмат, і ніхто не разыходзіўся. І хоць не на жарт пачынала марозіць, усе чакалі працягу.

Гарачую кропку ў першым фестывалі «Гальшанскі замак» павінны былі паставіць у фаер-шоу артысты калектыву «Крэсіва», на заканчэнне чаго гледачам абяцаўся святочны салют.

Акрабаты смела махалі кеглямі з вогненнымі наканечнікамі, бясстрашна глыталі агонь, а затым, як драконы, дулі гэтым полымем... Ды так відовішчна, што ва ўсіх прысутных аж захоплівала дух: яшчэ з часоў Сярэднявечча людзі так і не навучыліся падпарадкоўваць сабе гэтую стыхію. Адаптавалі — так, а вось перамагчы — так і не змаглі.

А абяцанага салюта ў канцы свята так і не было. Але і сутнасць у іншым: відаць, ён усё ж адбыўся, толькі непрыкметна — унутры кожнага з нас.

**Ілья ЛАПАТО.**
**Фота аўтара**
**і Анатоля КЛЕШЧУКА.**


За сімвалічную плату можна было адчуць сябе сапраўдным рыцарам.


Дзяўчаткі даказалі ўсім: сапраўдныя музыкі не цураюцца ніякіх інструментаў — нават дэкаратыўных дудачак.

# ВА УКРАІНЕ ЁСЦЬ «БРАТ» НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА!

## Карэспандэнт «Звязды» наведаў рэзідэнцыю Радзівілаў Алыка на Валыншчыне

**ГАВОРАЧЫ пра князёў Радзівілаў, мы ўяўляем найперш Нясвіжскі замак. Больш абазнаныя назавуць іншыя беларускія маёнткі роду — Паланечку, Манькавічы, Радзівілімонты, Альбу. Гэтыя палацы альбо ўжо загінулі альбо, закінутыя, знаходзяцца ў працэсе. Даследчыкі пералічаць таксама еўрапейскія ўладанні князёў — у Варшаве, Вільні, Парыжы, Ніцы, Рыме... Паглядзець гэта зможа ўжо далёка не кожны. Але часта па-за ўвагай застаецца ўкраінская вотчына Радзівілаў — найперш гэта мястэчка Алыка на Валыншчыне. Між тым, даехаць туды лёгка нават сваёй машынай (візы ж не трэба!): ад Брэста да Алыкі ўсяго 250 кіламетраў, ад Мінска — 550. Абедзьве лічбы супастаўныя з вандроўкай па Беларусі!.. Выехаўшы рана-раненька, пад ноч рэальна вярнуцца назад. Па дарозе можна пабачыць найцікавейшыя помнікі ўкраінскага дойлідства: старыя часткі Роўна альбо Луцка, замкі ў Дубне, Клевані, Крамянцы, вежу ў Астрогу...**

### МОКРЫЯ МАТРАЦЫ І ВЕКАВЫЯ БАСТЫЁНЫ

Прыехаўшы ў Алыку, ты адчуваеш лёгкае хваляванне. Такія грунтоўныя людзі, як Радзівілы, былі даволі паслядоўныя. Замак у Алыцы пабудаваны ў адным стылі з Нясвіжскім, нават мае такую ж самую афарбоўку. Дэкору відавочна бракуе — верагодна, ён проста не захаваўся. Але замак стаіць цалкам, са старой дахоўкай — прычым, у адрозненне ад Нясвіжскага, да нас дайшлі нават мураваныя бастыёны. Калі паглядзець на план Алыцкага замка — ён супадае з нашым: квадратны, з унутраным дварочкам, чатырма бастыёнамі, мастком...

Сёння ў Алыцкім замку Радзівілаў размешчаная Валынская псіхіятрычная лякарня № 2. У прысадах, дзе некалі шпацыравала шляхта, цяпер сохнуць матрацы з характэрнымі мокрымі плямамі. У двары цябе ветліва сустракае абарыгенка — відаць, пацыентка лякарні:

— Што, б...ць, зноўку прыпёрліся фатаграфаваць?! Калі вы ўжо, б...ць, нафатаграфуецеся?!

Ты стараешся нічога ёй не адказваць і ўвогуле не заўважаць. Гэта самы слушны спосаб паводзінаў з вар'ятамі.

Заходзіш у адчыненыя дзверы аднаго з карпусоў і разглядаеш таблічкі з надпісамі «9 аддзяленне», «8 аддзяленне». На лесвіцах — сеткі, каб вар'яты не скакалі. Далей ходу няма. Ты выходзіш і патрасаеш галавой, вяртаючыся ў думках да былых уладальнікаў палаца.

Цікава забрацца ў бастыёны, дзе захаваліся сцены таўшчынёй у некалькі метраў. Ды што «захаваліся» — паспрабуй такія зруйнуй!.. У бастыёнах шмат падземных адтулін і памяшканняў — проста рай для аматараў даўніны і таямніц. Паглядаеш на замураваную нішу ў склепе — і ўяўляеш радзівілаўскія скарбы за ёй. У найбольш захаваных падзямеллях кіраўніцтва вар'ятні трымае... бульбу для харчавання пацыентаў. А калісьці тут ляжалі гарматныя ядры для адпору ворагам...

Па-за замкам адкрываецца чароўны краявід — рэчка, лес... Радзівілы мелі тонкі густ!..

Пры самым замку захаваўся Траецкі касцёл сярэдзіны XVII стагоддзя. Ягоныя рысы падазрона нагадваюць табе нясвіжскі Касцёл Божага цела. Магчыма, прычына тут не толькі ў адным стылі — барока. І не толькі ў тым, што абодва храмы будавалі італьянскія дойліды...

Ты паглядаеш на касцёл, трымаючы ў руках старадаўняе фота 1914 года, на якім Фердынанд і Пелагея Радзівілы выходзяць з яго ў дзень свайго залатога вяселля... Ты шкадуеш, што фота не каляровае. Інакш ты мог бы галасна паабурацца разам з тагачаснымі мастацтвазнаўцамі наконт таго, што ў XIX стагоддзі мясцовыя жыхары расфарбавалі фігуры святых на фасадзе касцёла ва ўсе колеры вясёлкі. Ты паглядаеш сёння на пацьмянелыя фарбы і адно пасміхаешся.

Апошняе падабенства Алыкі і Нясвіжа дабівае цябе і пераконвае, што гэта ўсё — не супадзенні. Варта ўслухацца. У Нясвіжы ёсць СЛУЦКАЯ брама, а тут — ЛУЦКАЯ брама. Абедзьве названыя ад гарадоў, куды выводзіла дарога. І ў абедзвюх цяпер — крама!!! Праўда, у нашай Слуцкай браме хаця б сувенірная (у памяшканні колішняй капліцы), а ў Луцкай браме — брутальная харчовая, з гарэлкай і «чарнілам»...


Касцёл у Алыцы, як і нясвіжскі, збудаваны італьянскімі майстрамі ў стылі барока.

### «ЦУДОЎНЫ КАСЦЁЛ, ЗАМАК І РАТУША...»

Сёння Алыка — гэта пасёлак гарадскога тыпу Ківерцоўскага раёна Валынскай вобласці Украіны. Тут жыве, паводле звестак апошняга перапісу, 2865 чалавек. У час знаходжання ў Алыцы ты сустрэў максімум тузін тубыльцаў. Яшчэ чытаючы інфармацыю пра Алыку ў даведніках, ты адчуваў лёгкае дэжа вю: як і ў нашым Нясвіжы, усё тут нагадвае пра Радзівілаў, усё прасякнута духам гэтай вялікай Сям'і.

У найлепшых традыцыях Радзівілаў не абышлося без міфаў і загадак. Гэтым разам — адносна назвы мястэчка. Пэўнасці і адзінадушша ў гэтым пытанні ў даследчыкаў няма. Паводле адной версіі, Алыка — ад «лыка», з якога плялі лапці. Паводле іншай — ад вольхі (ва ўкраінскім варыянце). Паводле трэцяй — назва паходзіць ад цюркскага слова «aloka» — «яр». Адно вядомае дакладна: спачатку была рэчка Алыка, ад якой і назвалі паселішча.

У 1856 годзе польскі «Tygodnik ilustrowany» захоплена апісваў дарогу да Алыкі з боку Роўна: *«...цудоўны касцёл, замак і ратуша, беленькая царква, наўкол ахайныя, аточаныя садочкамі хаткі мяшчанаў, срэбныя люстры спакойных сонных сажалак, пагоркі, а між імі пакручастыя рачулкі найпекны ствараюць від»*.


Станіслаў РАДЗІВІЛ з жонкай Лі Буўе — роднай сястрой Жаклін КЕНЭДЗІ.

Паўтара стагоддзя таму, магчыма, так і было — Алыка квітнела, тут праходзіў гандлёвы шлях з Азіі ў Еўропу. Сёння хаткі месцічаў ужо не цешаць настолькі вока, адчуваецца пэўнае запусценне.

Але цікавіць цябе, безумоўна, не гэта, а спадчына нашых Радзівілаў, «філія» Нясвіжа.

### ПЕРШАЕ КАХАННЕ МАРСЭЛЯ ПРУСТА

Радзівілы атрымалі Алыку амаль пяць стагоддзяў таму. У тую пару валадаром Алыкі быў літоўскі гетман, трокскі ваявода Пятро Белы. Ягоны сын загінуў у баі, у 1500 Алыка адышла да дачкі Ганны, пасля яе раптоўнай смерці — да ўнучкі Ганны з Кішкаў, якая ў першым шлюбе пабралася з Янам Радзівілам Барадатым. З тае пары тут кіравалі Радзівілы. У 1547 годзе Ян Мікалай Чорны атрымаў ад імператара Карла V для сябе і брата спадчынны тытул «князь на Алыцы і Нясвіжы». Гэты тытул у 1549 годзе зацвердзіў кароль Жыгімонт Аўгуст.

У 1586 годзе (тады, дарэчы, Нясвіж атрымаў Магдэбургскае права) вядомы нам Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка стварыў тры ардынацыі: нясвіжскую, алыцкую і клецкую. Гэта значыць, што з таго часу маёнтак павінен быў пераходзіць ад бацькі да старэйшага сына і не мог быць падзелены альбо прададзены. У 1656 годзе, калі памёр і не пакінуў спадкаемцаў вялікі канцлер літоўскі Альбрэхт Станіслаў Радзівіл (ён, між іншым, фундаваў касцёл у Алыцы), замак перайшоў да нясвіжскага князя Міхаіла Казіміра — і ажно да XIX стагоддзя ардынацыя была «нясвіжская і алыцкая». Пакуль царскія ўлады не канфіскавалі ўсе маёнткі Дамініка Радзівіла, які перайшоў на бок французаў і стаў ад'ютантам Напалеона. Вярнуць Алыку ўдалося Антонію Радзівілу — таму самаму, які напісаў оперу «Фаўст», лібрэта для якой стварыў сам Гётэ. У час напалеонаўскай вайны ў замку зрабілі шпіталь, які быў там ажно да 1837 года.

Старыя жыхары Алыкі і сёння перакажуць вам пачутыя ад бабак і дзядоў гісторыі пра Фердынанда Радзівіла, ягонага сына Міхаіла, які ажаніўся з расіянкаю Марыяй Бернардакі, першым каханнем Марсэля Пруста, якая стала прататыпам Жыльберты ў творы «У пошуках страчанага часу».

Апошнім ардынатам Алыкі быў Януш Радзівіл, буйны палітык польскага сената, кіраўнік камісіі замежных спраў Польшчы ў 1935-39 гадах, лідар уплывовай кансерватыўнай партыі. У 1939 годзе Януша арыштавалі і кінулі ў канцлагер. Берыя прапаноўваў Радзівілу супрацоўніцтва, але арыстакрат не пагадзіўся.

Сын Януша Эдмунд узяў у жонкі Ізабэлу Радзівіл — дачку Караля Радзівіла з нашых Манькавічаў (што пад Столінам). Гэта была распаўсюджаная з'ява ў магнацкіх родах — жаніцца з далёкімі сваякамі іншай лініі. У міжваенны час сужэнцы паспелі збудаваць у Алыцы малочны завод, дзіцячы садок і лякарню. Родны брат Эдмунда Станіслаў у Амерыцы пабраўся з Каралінай Лі Буўе — роднай сястрой Жаклін Кенэдзі. Прэзідэнт Джон Кенэдзі нават быў хросным бацькам іх дачкі Ганны Крыстыны, а Станіслаў, у сваю чаргу, — хросным бацькам сына Кенэдзі...


Беларусу лёгка пазнаць у сённяшняй Алыцы рысы Нясвіжскага замка.

**P.S.** *Ты стаіш ля старой вартоўні ў парку Алыцкага замка і паглядаеш на магутныя сцены Радзівілаўскага дома, на вытанчаны, але занядбаны касцёл. Усё захавалася тут так, як і паўтара стагоддзя таму, калі і замак, і касцёл маляваў непараўнальны Напалеон Орда. Ты нават не перажываеш асабліва, што цяпер у замку вар'ятня. Гэта, прынамсі, гарантуе, што ён будзе жыць і падтрымлівацца ў больш-менш належным стане. Ты нават крыху радуешся, што Украіна не знайшла пакуль 70 мільёнаў долараў на рэканструкцыю. Бо Беларусь знайшла — але неразумнае іх выкарыстанне прывяло да таго выніку, што з Нясвіжскага замка, пакуль што, лічу, зрабілі сучасны катэдж, гопнуўшы к чорту ўсе напаміны даўніны.*

*Ты прыхавана хочаш, каб вар'яты на Валыншчыне не пераводзіліся.*

### КАМЕНТАР РАДЗІВІЛАЎ

***«Паміж Нясвіжам і Алыкай было даўняе супрацьстаянне...»***

Распавесці крыху пра Алыку я папрасіў 91-гадовую князёўну Эльжбету Радзівіл, якая зараз жыве ў Варшаве, а гэтым летам двойчы наведвала родны Нясвіж.

— Я ні разу не была ў Алыцы... — распавяла «Звяздзе» па тэлефоне пані Эльжбета. — Гэта звязана з тым, што адносіны між дзвюма ардынацыямі былі напружаныя. Так павялося, што галаву сям'і выбіралі ў Нясвіжы. Напрыклад, мой бацька Альбрэхт быў галавой сям'і. А алыцкія Радзівілы, у прыватнасці Януш, зайздросцілі, ім таксама хацелася!.. Бацька толькі мудра пасміхаўся на гэта ў свае геніяльныя вусы і казаў: «А, мне ўсё адно! Хай кажа, што ён галава сям'і! Але генеалагічна і юрыдычна — гэта я».

Супрацьстаянне сягае яшчэ ў XIX стагоддзе. Апошнім супольным ардынатам быў мой прапрапрадзядуля Антоні. Ягоныя сыны — Вільгельм і Багуслаў падзялілі ардынацыю на Нясвіжска-Клецкую і Алыцкую, першы атрымаў першае, другі — другое. І ад Вільгельма далей галава сям'і быў заўсёды з Нясвіжа.

Аднак супрацьстаянне заціхала, калі прыходзіў нейкі юбілей ці вяселле — тады ўся сям'я збіралася разам — ці ў Нясвіжы, ці ў Алыцы. Тады ўсе згадвалі, што незалежна ад рэзідэнцыі, мы, Радзівілы — адзіная Сям'я!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара**
**і з прыватнага архіва**
**сям'і Радзівіл.**

*Алыка—Мінск.*


Залатое вяселле Фердынанда і Пелагеі Радзівілаў (у цэнтры). Дэлегацыя з Нясвіжа — Марыя Браніцкая (злева ад Фердынанда), прабабуля пані Эльжбеты; Станіслаў Радзівіл (трэці шэраг, пяты злева), ад'ютант Пілсудскага, стрыечны дзядуля пані Эльжбеты; Дарота Радзівіл (трэці шэраг, у цэнтры), мама пані Эльжбеты; Тэрэса Радзівіл (трэці шэраг, шостая справа), цётка пані Эльжбеты; Вольга Радзівіл (верхні шэраг, у цэнтры) і справа ад яе Леон Радзівіл — дзядзька і цётка пані Эльжбеты; крайні правы ў верхнім шэрагу — Караль Радзівіл з беларускіх Манькавічаў, дзядзька пані Эльжбеты. 1914 год.